«речевым механизмам» можно сказать, что здесь первенствующую роль многократным повторениям «речевых блоков» и даже интонаций, пауз, ударений. Гармония мысли и слова – закон ораторского искусства. Безусловно, содержание в публичном выступлении является определяющим, так как оно раскрывает природу явления. Мастерство оратора в том и состоит, что глубокие знания рождают убежденность оратора. Желание убедить пробуждает эмоции, заразительность, помогает донести идеи до слушателей.

Таким образом, наряду со многими компетенциями современный менеджер в сфере культуры, равно как и любой другой отрасли, должен обладать коммуникативными навыками, раскрывающимися в ораторском искусстве. От этого зависит как успех отдельно взятой личности руководителя, так и процветание представляемой им организации.

1. Зубра, А.С. Ораторское искусство / А.С. Зубра. – Минск : Дикта, 2008. – 228 с.

2. Зубра, А.С. Формирование культуры личности: / А.С. Зубра. – Минск : Вышэйшая школа, 2004. – 206 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дубінчына Л.С.,** студ. 102 гр. ФЗН.
Навуковы кіраўнік – Мармыш Т.М.

## ЗАХАВАННЕ НЕКРОПАЛЕЙ БЕЛАРУСІ: АД ТЭОРЫІ ДА ПРАКТЫКІ

Матэрыяльная культурная спадчына Беларусі – колькасна багатая і стылістычна разнастайная. Шматлікія культавыя будынкі – цэрквы,

касцёлы і сінагогі, гістарычная забудова гарадоў, вясковая архітэктура і помнікі археалогіі ствараюць яе ўнікальнае аблічча. Часта з гэтага пераліку неапраўдана выпадае такі значны элемент як некропалі. Некропалі – маўклівыя сведкі гістарычнага працэсу, звязаныя з культам шанавання продкаў, што і па-сёння застаецца актуальным для беларускай культурнай прасторы, сфарміраванай на фоне дыялогу этнасаў, што жылі і жывуць побач – беларусаў, украінцаў, рускіх, палякаў, габрэяў.

Тэрмін «некропаль» паходзіць ад грэч. «nekros» – мёртвы і «polis» – горад і азначае магільнік ці комплекс пахаванняў. Да некропаляў адносяцца курганы, грабніцы, могілкі [2, с. 873]. Часта як сінанімічныя некропалю выкарыстоўваюцца тэрміны «могілкі» ці «гістарычныя могілкі». Могілкі – гэта тэрыторыя, спецыяльна адведзеная для пахавання нябожчыкаў [2, с. 584]. Пад «гістарычнымі могілкамі» звычайна разумеецца афіцыйна закрытыя ландшафтныя тэрыторыі пахаванняў, якія ўяўляюць сабой своеасаблівыя мясціны памяці – зборы старых надгробкаў з разнастайных матэрыялаў, мастацка аздобленых помнікаў, капліц і алтарняў, асобных крыжоў і каваных агароджаў, іншых адрозных элементаў, найстаражытнейшыя пахаванні на якіх датуюцца прыблізна XVIII–XIX стст. [3, с. 428]. Гістарычных пахаванняў на тэрыторыі Беларусі знаходзіцца неверагоднае мноства. Гэтыя пахаванні маюць гістарычную каштоўнасць, з’яўляюцца, часам, адзіным сведчаннем жыццяў людзей, чые імёны захоўваюць стагоддзямі магільныя пліты.

Могілкі (некропалі), іх апісанне, вывучэнне і захаванне з'яўляюцца галоўным прадметам вывучэння такой дапаможнай гістарычнай дысцыпліны як некрапалістыка. Некрапалістыка ўзаемадзейнічае з тэорыяй і гісторыяй архітэктуры, краязнаўствам, этнаграфіяй, эпіграфікай, геральдыкай, палеаграфіяй, картаграфаваннем, петралогіяй і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некрапалістычныя даследванні дазваляюць паглядзець на гісторыю і культуру з часам з нестандартнага ракурса, «прачытаць» схаваныя сэнсы і актуалізаваць у сучаснасці культурную спадчыну нашых папярэднікаў. Нездарма існуе меркаванне: могілкі кажуць не толькі пра памёрлых, але і пра жывых, пра іх культурны ўзровень, мастацкі густ [1, с. 4].

Некропалі апынуліся ў фокусе даследчыцкай дзейнасці шэрагу навукоўцаў. Сярод беларускіх вучоных у дадзеным кантэксце неабходна ўзгадаць Міхася Раманюка, Міхася Чарняўскага, Вольгу Лабачэўскую, Сяргея Грунтова. Замежныя даследчыкі, заангажаваныя тэмай некропалей, гэта, найперш, Януш Багдановіч, Эдмунд Малаховіч, Міхаіл Насонаўскій, Мічэслаў Яцкевіч.

На сучасным этапе развіцця беларускай некрапалістыкі значным з'яўляецца запуск праекта «Некропалі Беларусі» (Niekropali.by). Праект распачаў сваю дзейнасць ў 2013 г. і створаны па ініцыятыве ГА «Беларусі камітэт ІКАМОС» і краязнаўчага клуба «Дыярыуш» (БДПУ імя Максіма Танка) дзякуючы Маладзёваму грамадскаму аб'яднанню «Фаланстэр». Праект уяўляе сабой сайт, на якім базуецца каталог старадаўніх могілак, асобна фіксуецца інфармацыя пра пахаванні знакамітых асоб, збіраюцца тэматычныя артыкулы, размяшчаюцца метадычныя рэкамендацыі для інвентарызацыі могілак. На пачатку працы па стварэнні каталога адбывалася ўнясенне на сайт картак з інфармацыяй паводле даследавання пяці могілак: Кальварыйскіх (Мінск), Гальшанскіх (Ашмянскі раён), Дудзіцкіх (Пухавіцкі раён), Трышынскіх (Брэст), Радашковіцкіх (Маладзечанскі раён). На дадзены мамант у базу дадзеных унесена інфармацыя больш чым аб 50 могілках, гэта 2300 уліковых картак. Дадзены праект – доўгатэрміновы і праца над ім мае пастаянны характар: рэгулярна папаўняецца каталог, адбываецца адзначэнне апісаных могілак на мапе краіны, збіраюцца артыкулы па адпаведнай тэматыцы. Праект

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

існуе дзякуючы неабыякавым да лёсу гістарычных могілак валанцёраў, якія ажыццяўляюць каардынацыю, непасрэдную працу на могілках па іх вывучэнні і зборы інфармацыі, папаўненне каталогу. У межах праекту адбываюцца з'езды некрапалістаў.

Акрамя праекту «Некропалі Беларусі» можна вылучыць працу на габрэйскіх могілках, якія высілкамі актывістаў і разнастайных арганізацый даволі плённа даследуюцца на тэрыторыі Беларусі.

З 2004 г. існуе праект «Экспедыцыя па габрэйскіх месцах Беларусі», які рэалізуецца Прадстаўніцтвам габрэйскага агенцтва для Ізраіля ў Рэспубліцы Беларусь і Габрэйскім студэнцкім культурным цэнтрам «Гілель». У рамках праекта ўдзельнікі цягам некалькіх дзён займаюцца валанцёрскай працай на могілках: высечкай хмызняку, прыбіраннем надмагілляў, фарбоўкай агароджы (пры наяўнасці). Таксама праводзіцца навучальная каталагізацыя могілак: надмагіллям надаецца асобны нумар, іх фатаграфуюць, і, па магчымасці, перапісваюць асноўныя дадзеныя з тэкста эпітафіі (імя нябожчыка, дату смерці). За час існавання праекта была праведзена праца на габрэйскіх могілках населеных пунктаў Друя, Грозава, Валожын, Свет, Свіслач, Дзярэчын, Смілавічы, Чэрвень, Гомель, Парычы і інш. Нажаль, на дадзены момант, ніводны са складзеных каталогаў не апублікаваны. З 2015 г. дзейнічае праект «MEGA» (Memory. Education. Generation. Action), у рамках якога ГСКЦ «Гілель» праводзіцца аналагічная праца на габрэйскіх могілках (Рагачоў, Ружаны ў 2015 г.). Акрамя таго, габрэйскае агенцтва працягвае рэалізоўваць праект «Экспедыцыя па габрэйскіх месцах Беларусі» самастойна.

У 2010–2012 гг. на тэрыторыі Беларусі праводзіліся навучальна-даследніцкія экспедыцыі на габрэйскіх могілках праектам «Віртуальны штэтл» Музея гісторыі польскіх габрэяў (Варшава) супольна з Музеем гісторыі і культуры габрэяў (Мінск). Падчас экспедыцый каталагізавана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

некалькі могілак, вынікі пададзены на афіцыйным сайце праекта www.sztetl.org.pl.

У 2012–2015 гг. Цэнтр навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў юдаізму ва ўстановах вышэйшай адукацыі «Сэфер» (Масква) арганізаваў шэраг палявых школ-экспедыцый у п. Страўнік, г. Лепель, г. Глыбокае, падчас якіх была праведзена поўная каталагізацыя мясцовых габрэйскіх могілак: нумарацыя надмагілляў, складанне плана-карты могілак, замер геаметрычных памераў надмагілляў, фотафіксацыя надмагілляў, фіксацыя тэкстаў эпітафій, пераклад тэкстаў эпітафій на рускую і ангельскую мовы. Каталогі могільнікаў п. Страўнік і г. Лепель выдадзены ў друкаваным варыянце, працягваецца праца над каталогам могілак г. Глыбокае. Матэрыялы таксама даступныя ў выглядзе электроннай базы дадзеных на сайце www.sefer.ru.

У 2015 г. ініцыятыўная група з Санкт-Пецярбурга пачала рэстаўрацыйныя працы на габрэйскіх могілках у п. Бешанковічы: гэта і высечка хмызняку, і узняцце паваленых надмагілляў, і нумарацыя, і складанне плана-карты. Сіламі актывістаў у пачатку 2016 г. на могілках былі ўсталяваны інфармацыйныя стэнды; плануецца працяг прац па аднаўленні і каталагізацыі могілак.

Падагульняючы выкладзенае вышэй, можна зрабіць некалькі высноў:

- сёння ў Беларусі праца, звязаная з некропалямі, адбываецца ў двух асноўных кірунках. Па-першае, гэта іх даследаванне і інвентарызацыя (каталагізацыя), па-другое, праводзяцца рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы. Таксама, важна адзначыць, што айчынныя могілкі ўяўляюць навуковы інтарэс не толькі для масцовых даследчыкаў, а і для спецыялістаў з іншых краін – Польшчы, Расіі, Ізраіля. Гэта звязана з тым, што гістарычныя пахаванні на нашай тэрыторыі маюць такую асаблівасць як поліэтнічнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- праца па захавнні некропаляў, з большага, вядзецца на валанцёрскіх пачатках. Валанцёры – ахвотныя, на якіх трымаецца некрапалістычная справа на Беларусі. Аднак, гэтага, безумоўна, не дастаткова, каб максімальна захаваць і даследаваць дадзены пласт культурнай спадчыны нашай краіны.
- пытанні стану гістарычных некропаляў дрэнна асвячаюцца ў айчынных СМІ, шырокая грамадскасць мала дасведчаная ў гэтым аспекце.

---


1. На «панскіх» могілках Плябані / укл. В. Сямашка. – Мінск : Мэдысонт, 2013. – 140 с.
2. Советский энциклопедический словарь / гл. ред. А.М. Прохоров. – М. : Сов. энцикл., 1985. – 1600 с.
3. Сямашка, В. Праблемы аховы гістарычных могілак Беларусі // В. Сямашка // Трэці Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі : працоўныя матэрыялы (Каўнас, 11–13 кастрычніка 2013 г.) / навук. рада: А. Казакевіч (старшыня) [і інш.]. – Каўнас : VYTAUTAS MAGNUS UNIVERSITY PRESS, 2014. – Том 3. – С. 427–430.


**Дулова А.М.,** студ. 408 гр.
Научный руководитель – Зезюля А.Г.

## ЗАМКИ БЕЛАРУСИ

В последнее десятилетие можно наблюдать стремительное развитие туризма в Беларуси. Большое количество экскурсий, различного рода мероприятий осуществляется на территории Беларуси. Также в нашей стране существует немало мест, сохранивших след истории. Особенно

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ